У мэтах папулярызацыі беларускай мовы 12 студзеня 2023 г. у 1 «Б» класе была праведзена гульня «Традыцыі беларускага народа».

Вучні ў ходзе гульні паглыбілі свае веды пра наш беларускі край, пра традыцыйныя святы беларусаў, дайшоўшыя да нас з сівых вякоў; дзеці таксама ўзбагачалі свой слоўнікавы запас, трэніравалі сваю памяць і ўвагу, стараліся апярэдзіць сапернікаў у кемлівасці і здагадлівасці. А складзеныя ў групах і разгаданыя ўсім класам крыжаванкі дазволілі праявіць творчую актыўнасць і самастойнасць нашым першакласнікам.

Спланаванае і праведзенае такім чынам мерапрыемства актывізуе маўленчую дзейнасць, развівае творчыя здольнасці вучняў, прывівае любоў да роднай мовы і Радзімы.





